

# Тужлівая цішыня...

Міне зіма. І на памежжы вясны ды лета старажытнае мястэчка Паставы пачне рыхтавацца да прыёму гасцей: зноў з'едуцца сюды ўдзельнікі традыцыйнага Міжнароднага фестывалю народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік". І проста не верыцца, што ўпершыню за сваю шматгадовую гісторыю гэтае ўсенароднае любімае свята пройдзе без аднаго з галоўных сваіх герояў — без Уладзіміра Мікалаевіча Грома: 10 снежня раптоўна абарваўся яго зямны шлях...

Асірацеў, страціўшы свайго дырэктара, Крупіцкі цэнтр культуры, знаны далёка за мяжою Мінскага раёна. Асірацеў выпеставаны ім, прызнаны далёка за межамі Беларусі, заслужаны аматарскі калектыў "Крупіцкія музыкі". Асірацела самабытная галіна музычнай творчасці, навукі, педагогікі, якую развіваў Уладзімір Гром — заслужаны работнік культуры краіны, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дацэнт БДУ культуры і мастацтваў, аўтар нотных зборнікаў і метадычных выданняў, энтузіяст адраджэння самабытных нацыянальных інструментаў.

Прыродны артыстызм дазваляў яму пераўвасабляцца і ў сучаснага па-еўрапейску элегантнага лектара падчас правядзення заняткаў навукова-творчай лабараторыі па вывучэнні народных інструментаў, і ў зухаватага народнага музыку-мультыінструменталіста, і ў дасціпнага апавядальніка, здатнага кожнаму ўзняць настрой сваім невычэрпным і каларытным беларускім гумарам... А хто ж не памятае — смех і грэх, — як Уладзімір Мікалаевіч рабіў сваю першую дуду... са скуранай жончынай спадніцы! Хто ж не захапляўся адроджаным ансамблем з амаль дзесятка дудаў, згуртаваны У. Громам, а потым — яго ж "Гудамі", гуртом старажытных беларускіх інструментаў, створаным у родным універсітэце...

Не дажыў да сваіх 57 гадоў палешук-самародак, Музыкант ласкаю Божай. Таленавіты арганізатар, самабытны і светлы чалавек, якому гэтак пасавала яго гучнае прозвішча. Адышоў у вечную Цішыню.

**Калектыў штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва"**